# Навука

# Змест


- Георгій Каніскі
- Казімір Нарбут
- Саламон Майман
- Міхал Карповіч
- Караль Вырвіч
- Мацей Догель
- Адам Нарушэвіч
- Марцін Пачобут-Адляніцкі

У пашыпэнне Асветніцтва на беларускіх землях вялікі ўклад зрабіў праваслаўны дзеяч ***Георгій Каніскі*** (1717 - 1795). Яго погляды былі глыбока рэгілійнымі. Разам з тым ён паважліва ставіўся да поглядаў Каперніка і Галілея. Каніскі збіраў архіўныя крыніцы па гісторыі праваслаўнай царувы ў Беларусі, выступаў супраць усеўладдзя магнатаў, за моцную цэнтральную уладу. Прамова Каніскага ў абарону правоў дысідэнтаў была перакладзена на еўрапейскія мовы як узор абароны верацярпімасці.



Філасофскую думку прадстаўляў віленскі прафесар ***Казімір Нарбут*** (1738 - 1807). Першапачатковую адукацыю ён атрымаў у пі ярскай школе. Затым вучыўся ў піярскім вучылішчы ў Рыме. Казімір Нарбут лічыў, што філасофія павінна служыць грамадству. Ён падтрымліваў рэформы, якія праходзілі ў Рэчы Паспалітай, у прыватнасіц, выказваў свае захапленне будаўніцівам Дняпроўска-Бугскага канала, развіццём мануфактур.



Еўрапейскую папулярнасць сваімі філасофскімі працамі здабыў ***Саламон Майман*** (каля 1753 - 1800). Нарадзіўся ён каля мястэчка Мір. Адукацыю атрымаў у галоўнага рабіна Слуцка. Ва ўзросце дваццаці пяці гадоў Майман адправіўся ў Германію, дзе вывучаў філсофію, фізіку, матэматыку і французскую мову. Ён быў першым каментатарам і крытыкам вядомага нямецкага філосафа Імануіла Канта.



Прыхільнікам фізіякратаў быў ураджэнец Брэстчыны ***Міхал Карповіч*** (1744 - 1803). Ён атрымаў адукацыю ў Езуіцкім калегіуме, затым выкладаў багаслоўе і царкоўную гісторыю. Міхал Карповіч адзін з першых у ВКЛ пачаў крытыкаваць прыгоннае права.



Папулярнасць сярод вучняў школ набылі кнігі ***Караля Вырвіча*** (1717 - 1793) у якасці падручнікаў па ўсеагульнай гісторыі. Вырвіч лічыў, што гісторыя — гэта сукупнасць змен у палітычным жыцці, звычаях, рэлігіі, навуцы, мастацтве. Важнае месца ён адводзіў ролі эканомікі ў грамадскім жыцці, а галоўнай крыніцай багацця краіны лічыў гандаль.



Развіццё гістарычнай навукі звязана з іменем ***Мацея Догеля*** (17154 - 1760). Ён нарадзіўся ў вёсцы Гембулы Лідскага павета, скончыў піярскую школу ў Шчучыне. З 1748 г. як пасол Рэчы Паспалітай Мацей Догель атрымаў магчымасць працаваць ў бібліятэках Германіі, Францыі, Галандыі. Ён меў доступ да каралеўскіх архіваў Кракава і Нясвіжа. Гэта дазволіла апублікаваць зборнік дакументаў «Дыпламатычны кодэкс Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага». Сабраныя ім матэрыялы раскрывалі гісторыю знешняй палітыкі Польшчы, Літвы і Беларусі ў XIII – XVIII стст.



Па прапанове караля вядомы польскі паэт, ураджэнец Піншчыны ***Адам Нарушэвіч*** (1733 - 1796) падрыхтаваў «Гісторыю польскага народа». Для напісання кніг ён арганізаваў групу капіравальшчыкаў. Іх накіравалі ў Германію, Італію, Швейцарыю для перапіскі гістарычных дакументаў. Даследчык цікавіўся ўзаемаадносінамі царквы і дзяржавы, паходжаннем прыгоннага права, шляхамі пераадолення заняпаду краіны. Яго ідэалам была моцная каралеўская ўлада.



Значны ўклад у развіццё навукі ўнёс ураджэнец Гродзеншчыны ***Марцін Пачобут-Адляніцкі*** (1728 - 1810). Будучы студэнтам Віленскай акадэміі, ён зацікавіўся астраноміяй. Каб пашырыць свае веды, накіраваўся ў пражскі ўніверсітэт. Затым Вільні даследчык арганізаваў астранамічную абсерваторыю. Ён вывучаў планеты Сонечнай сістэмы, адкрыў невядомае сузор'е, вызначыў геаграфічныя каардынаты многіх населеных пунктаў Беларусі. На працягу 23 гадоў Пачобут-Адляніцкі кіраваў Галоўнай школай ВКЛ.



# Дзякуй за ўвагу!